Белая Вежа — 2023

# СТАЦЬ МЕСЦАМ ЛЮБОВІ І МІРУ

## У Брэсце прайшоў дваццаць сёмы па ліку Міжнародны тэатральны фестываль

**Вось ужо больш за чвэрць стагоддзя восень у Брэсце трывала асацыіруецца са святам аматараў Мельпамены. Тэатральны фестываль гэтым разам падняў сваю заслону 8 верасня. Па традыцыі апошніх гадоў адкрыў яго старшыня Брэсцкага гарвыканкама. Сяргей ЛАБАДЗІНСКІ выказаў надзею, што форум парадуе адкрыццямі, падорыць асалоду сустрэчы з сапраўдным мастацтвам.**



Так і сталася. Высокую ноту фестывалю задалі артысты Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага. Стартаваў тэатральны форум рок-операй «Граф Монтэ-Крыста». Спектакль па знакамітым рамане Аляксандра Дзюма паставіў заслужаны дзеяч мастацтваў Сяргей Кавальчык. Музыку напісаў Цімур Каліноўскі. Несумненна спектакль стаў святам судакранання з тэатрам. У антракце давялося пачуць меркаванне, з якім пагаджаюся з задавальненнем: «Калі б на «Вежы» быў усяго толькі гэты годны спектакль, і то фестываль меў бы права на існаванне».

Відавочна, што па задумцы аўтараў і ў выкананні Руслана Чарнецкага Эдмон Дантэс — сапраўдны герой. Ён прагне справядлівай адплаты за страчаныя сям'ю, нявесту, свабоду. Ды мяжа паміж перамогай справядлівасці і помстай вельмі тонкая. А добрыя намеры, як вядома, не раз даводзілі да пекла. І калі людскасць у душы героя перамагае, наступае палёгка, хочацца верыць у сябе, у чалавецтва, у дабро. І за гэта трэба падзякаваць Сяргею Кавальчыку і яго камандзе.



Драма «Камень дурасці» Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі — работа зусім іншага кшталту. Але яна таксама пра нешта вельмі важнае ў жыцці. П'еса Канстанціна Сцешыка, па якой Людміла Фёдарава паставіла спектакль, згадвае матывы Сярэднявечча, дакладней, сюжэты з карцін галандскіх мастакоў, што адлюстроўвалі хірургічныя аперацыі па выразанні «каменя» з галавы, каб зрабіць чалавека разумным. Дзеянне мяжуе з сапраўдным шарлатанствам, ідыёма «выдаляць камень» ужо тады азначала — падманваць.

Вось і галоўны герой Раман пасля складанай аперацыі на галаўным мозгу жыве нібы ў свеце падману. Яго нічога не радуе. Ва ўсім ён бачыць несапраўднасць, недарэчнасць, штучнасць. Часам падаецца, што ён больш востра адчувае рэчаіснасць і не баіцца сказаць усё, што думае. Напрыклад, дурнямі назваць сваіх сяброў, якія раяць адмовіцца ад малака, якое, паводле іх вызначэння, гной, і ад цукру, бо ён — наркотык. Раман жорстка высмейвае сябра-спартсмена, які не ўжывае лекаў, а лечыцца травамі. Яму вельмі шкада сваіх бацькоў, што не здолелі захаваць сям'ю, а цяпер ледзь агорваюць сваю адзінокую старасць: бацька папівае ў адзіноце на кухні, а маці перыядычна нацягвае на галаву недарэчны парык, падобны на здохлую варону.

Раман у нейкі момант вырашае добраахвотна пакінуць свет, аддае даўгі, наведвае ўсіх, нібы перад расстаннем. Але ў апошні момант не падымаецца рука... Ёсць у яго жыцці і светлая паласа — душэўныя размовы з дзяўчынай Марынай, якая не вытрымала аперацыю і цяпер прыходзіць да яго ў сне. Яна дапамагае яму паглядзець крытычна на сябе і заўважыць, што не ўсё дрэнна вакол. Напрыклад, ёсць сям'я, жонка і дачка, якія зусім не заслужылі яго жорсткага ўчынку.

Напружання дадае вельмі ўдалая ігра святла і ценю. Мінімалістычная, графічная кампазіцыя распадаецца на дзве рэальнасці. І кожны герой п'есы «варыцца» ў сваёй, калі не хапае цэласці ўнутры і падтрымкі звонку. Нават калі здаецца, што ты выдаліў «камень дурасці», паразумнеў, выходзіць, што падманваеш усіх і сябе.



І ўсё ж канец у гісторыі аптымістычны, галоўны герой знаходзіць у сабе сілы зрабіць той самы важны крок, каб навучыцца жыць нанава: «Хоць бы таму, каб некалі дачка сказала пра нас з жонкай: «Мае старыя». Ён разумее, як важна жыць і быць разам, а не так, як яго бацькі, што сёння шукаюць прычыну сваёй адзіноты, у якой вінаватыя самі.

Наогул цікавых работ, адкрыццяў падчас сёлетняга фэсту было нямала. Крытыка станоўча адзначыла работу дацка-расійскага тэатра «Дыялог» з Капенгагена пад назвай «Сапраўдная гісторыя фрэкен Хільдур Бок, равесніцы стагоддзя». Рэжысёр Аліса Ветрава вызначыла яе як аптымістычную драму. Гэтую споведзь стагадовай жанчыны, што пражыла надзвычай цікавае жыццё, глядач успрыняў вельмі цёпла.

А **мастацкі кіраўнік названага тэатра Таццяна ДЗЕРБЯНЁВА-ЯКАБСОН** сказала ў размове з журналістамі, што тэатр цяпер асабліва патрэбны людзям, бо ён выхоўвае маральнасць, уласна становіцца месцам любові і міру. Дарэчы, сама мастацкі кіраўнік у фестывалі ўдзельнічае ўжо чацвёрты раз.

Варта сказаць, што сёлетняя «Вежа» вызначылася мноствам твораў класікі. І гэта, несумненна, станоўчы факт. Бо класіка заўсёды сучасная, а яе ўвасабленне на аснове аўтарскага прачытання толькі падкрэслівае актуальнасць класічных твораў. Спектакль «Галаўлёвы» Новасібірскага драматычнага тэатра «Стары дом» стаў сапраўдным гіпнатычным сеансам ад найлепшага расійскага інтэрпрэтатара класікі, рэжысёра Сяргея Фядотава, дзе рэалізм штодзённага расійскага жыцця праламляецца ў люстэрку містыцызму. Гісторыя гібелі адной сям'і, пра якую расказаў Салтыкоў-Шчадрын у XIX стагоддзі, ператварылася ў тэатральны хорар.

Сяргея Фядотава брэсцкая публіка добра памятае. У 2010 годзе ён прывозіў да нас спектакль «Калека з Інішмана». Тады работа стала нумарам адзін, атрымала заслужанае Гран-пры форуму. Цяпер таксама чаканні публікі апраўдаліся.

Даволі цікавай была лялечная праграма. Не засталося незаўважным выступленне гаспадароў фестывалю — работа Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы «Заходзіць андроід у бар» і спектакль брэсцкіх лялечнікаў «Асенні марафон».

Форум тэатральнага мастацтва завяршыўся ў мінулую суботу. Праграма дзевяці фестывальных дзён умясціла ў сябе 28 спектакляў калектываў з дзевяці краін свету. У суботу ж былі абвешчаны вынікі конкурснай праграмы. Найлепшым спектаклем вялікай формы стаў спектакль «Навальніца» тэатра «Школа драматычнага мастацтва» з Масквы, найлепшым спектаклем малой формы прызнана работа тэатра «Крэда» з балгарскай сталіцы «Тата заўсёды мае рацыю». У намінацыі «Найлепшы акцёрскі ансамбль» узнагароду атрымаў «Камень дурасці» Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Аляксандра ШУЛЬГАЧА.**

Спорт-тайм

# Удзел у Алімпіядзе — мара кожнага спартсмена, і нельга забраць у яго мару

## У традыцыйным аглядзе «Звязды» — актуальныя спартыўныя навіны

**ГЕРОЙ ТЫДНЯ.** Беларус Яўген Ціханцоў стаў бронзавым прызёрам чэмпіянату свету па цяжкай атлетыцы, што прайшоў у сталіцы Саудаўскай Аравіі Эр-Рыядзе. Яўген, які выступае ў вагавой катэгорыі 102 кг, у рыўку выканаў удалыя падыходы на 175 кг, 179 кг і 183 кг, дзякуючы чаму стаў уладальнікам малога залатога медаля ў гэтым практыкаванні. У штуршку паспяховы аказаўся толькі падыход на 211 кг, дзве спробы зафіксаваць 217 кг выйшлі няўдалымі. Але агульная сума беларуса ў 394 кг прынесла яму трэцяе месца. Чэмпіёнам свету ў дадзенай вазе стаў кітаец Лю Хуанхуа (404 кг), другім — карэец Янг Ён Хак (399 кг).



**ПАДЗЕЯ ТЫДНЯ.** У Маскве прайшло сумеснае пасяджэнне камісій спартсменаў Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь і Алімпійскага камітэта Расіі. **Прэзідэнт НАК Беларусі Віктар ЛУКАШЭНКА** падкрэсліў, што нягледзячы на санкцыі з боку міжнародных федэрацый, алімпійскім камітэтам і міністэрствам спорту дзвюх краін удалося выбудаваць дакладны каляндар спаборніцтваў. Прэзідэнт НАК расказаў, што Беларусь прыкладае вялікія намаганні для зняцця санкцый з атлетаў. «Знаходзімся ў кантакце з Міжнародным алімпійскім камітэтам, вядзём дыялог з міжнароднымі федэрацыямі па відах спорту, каб гэтыя абмежаванні былі знятыя. Паверце, паважаныя спартсмены, намаганні прыкладаюцца сур'ёзныя», — запэўніў Віктар Лукашэнка. Што датычыцца ўдзелу беларускіх спартсменаў у Алімпійскіх гульнях 2024 года ў Парыжы, то, па словах Прэзідэнта НАК Беларусі, яшчэ рана аб тым казаць, бо пакуль няма афіцыйнага запрашэння. «Калі будзе запрашэнне, яны (Міжнародны алімпійскі камітэт. **— Аўт.**) будуць выстаўляць адпаведныя патрабаванні, нейкія ўмовы. Ці маем мы, спартыўныя чыноўнікі, права забараняць людзям ехаць? Я думаю, не. Нягледзячы на разнастайнасць спаборніцтваў, кожны спартсмен марыць паехаць на Алімпіяду і перамагчы там. Усе спартсмены — дарослыя людзі і яны могуць самі прыняць рашэнне і адчуваць за яго адказнасць. Павінны паглядзець, вывучыць усе ўмовы, усю інфармацыю, самі прыняць рашэнне: едуць яны з гэтым ці не», — сказаў ён. Па яго словах, Нацыянальны алімпійскі камітэт вядзе дыялог з МАК, але Міжнародны алімпійскі камітэт знаходзіцца ў няпэўнасці і сам не ведае, што рабіць. Віктар Лукашэнка таксама не выключыў, што вырашэнне пытання допуску беларускіх спартсменаў да міжнародных спаборніцтваў спецыяльна зацягваецца, каб яны не паспелі прайсці кваліфікацыйны адбор на Алімпіяду.

Што да магчымасці аспрэчвання рашэнняў міжнародных чыноўнікаў, кіраўнік НАК Беларусі падкрэсліў: такія намаганні робяцца, але разлічваць на нейкі станоўчы зыход наўрад ці варта. «Апратэставаць можна, накіроўваючы звароты ў МАК, і мы гэта робім. Звяртацца, напрыклад, у той жа суд у Лазане — гэта доўга, вельмі дорага, а вынік практычна зразумелы. Таму там, дзе можна весці нармальны дыялог і разумнае рашэнне можа быць прынята, мы тое робім», — рэзюмаваў ён.

Падчас пасяджэння камісій спартсменаў абмяркоўвалася таксама выступленне беларускіх і расійскіх спартсменаў пад нейтральным сцягам. «Больш за 20 міжнародных федэрацый ужо прыняло рашэнне аб допуску беларускіх і расійскіх атлетаў. Вядома, статус нашых спартсменаў на гэтых турнірах нас не задавальняе. Неабходна працягваць змагацца за права выступаць пад сваімі нацыянальнымі сімваламі», — адзначыў **старшыня камісіі спартсменаў НАК Беларусі, алімпійскі чэмпіён Аляксандр БАГДАНОВІЧ.** Па яго словах, выступленне пад нейтральным сцягам — гэта дыскрымінацыя кожнага спартсмена, бо кожны атлет прадстаўляе сваю краіну, нясе свой сцяг, герб. Аляксандр Багдановіч падкрэсліў, што кожны спартсмен хоча быць сімвалам перамогі для сваіх балельшчыкаў. «Гэта, вядома, сумна, што яму не даюць такой магчымасці. Але, з іншага боку, не даць яму магчымасці паўдзельнічаць нават без сцяга і гімна — мы таксама не можам так зрабіць. Удзел у Алімпіядзе — мара кожнага спартсмена, і мы не можам забраць у яго гэтую мару», — адзначыў старшыня камісіі спартсменаў НАК. Аляксандр Багдановіч заўважыў, што калі нашы спартсмены змогуць паўдзельнічаць у Алімпійскіх гульнях без сцяга, гімна і герба, неабходна зрабіць усё, каб яны дома адчувалі сябе сапраўднымі героямі.

**ЛІЧБА ТЫДНЯ.** У Барнауле завяршыліся міжнародныя спаборніцтвы па веславанні на байдарках і каноэ «Алтайская рэгата». Галоўным стартам турніру стала «Гонка чэмпіёнаў», у якой выступілі 40 наймацнейшых байдарачнікаў і канаістаў з васьмі краін, у тым ліку з Беларусі. У фінале мужчынскай байдаркі-адзіночкі ўвесь п'едэстал занялі беларусы: на першым месцы — Уладзіслаў Кравец, на другім — Дзмітрый Натынчык, на трэцім — Мікіта Борыкаў. У аналагічным выглядзе праграмы ў жанчын перамагла наша Вольга Худзенка, а Марына Літвінчук заняла другое месца. У заездзе каноэ-адзіночак усе тры месцы на п'едэстале зноў занялі беларускі: «золата» ў Алены Наздровай, «серабро» ў Вольгі Клімавай, «бронза» ў Юліі Трушкінай. У фінале змешаных экіпажаў у байдарачнікаў перамог Дзмітрый Натынчык у пары з расіянкай Анастасіяй Панчанкай, а мікст сярод канаістаў выйграў беларуска-расійскі дуэт: Юлія Трушкіна — Захар Пятроў. Таксама медалі ў згаданай дысцыпліне заваявалі Вольга Худзенка («серабро»), Мікіта Борыкаў («бронза») і Арцём Козыр («бронза»).

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

Даты | Падзеі | Людзі

### 19 ВЕРАСНЯ

У краіне

**1883** год — ва ўрочышчы Бярозаўка Лідскага раёна заснаваны шклозавод (у гады Вялікай Айчыннай вайны разбураны, у 1944-м адноўлены як шклозавод «Нёман»).



**1907** год — нарадзіўся (Слуцкі раён) Фёдар Піліпавіч Бруй, Герой Савецкага Саюза. У Вялікую Айчынную вайну з верасня 1942-га на Варонежскім, 1-м Украінскім франтах. Камандзір стралковага батальёна маёр Бруй вызначыўся пры вызваленні Украіны: у канцы верасня 1943-га высадзіўся з батальёнам на Труханаў востраў на Дняпры, адкуль два дні вёў агонь па праціўніку ў Кіеве, затым захапіў на поўнач ад Кіева плацдарм на правым беразе Дняпра і адбіў дзесяць варожых контратак.

**1942** год — адбыўся бой Расонскай партызанскай брыгады імя Сталіна з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў вёсцы (цяпер гарадскі пасёлак) Расоны, які ўвайшоў у гісторыю Вялікай Айчыннай вайны пад назвай Расонскі бой. У ноч на 19 верасня артабстрэлам умацаванняў фашысцкага гарнізона партызаны вымусілі гітлераўцаў пакінуць Расоны, знішчылі каля 20 акупантаў, захапілі шмат зброі. На тэрыторыі Расонскага, Асвейскага і суседніх раёнаў была створана Расонска-Асвейская партызанская зона.

У свеце

**1888** год — нарадзіўся Усевалад Міканоравіч Іваноў, рускі пісьменнік.

**1918** год — Саўнаркам зацвердзіў Дэкрэт аб забароне вывазу і продажу за мяжу прадметаў асаблівага мастацкага і гістарычнага значэння.

**1943** год — пачалася найбуйнейшая ў гады Вялікай Айчыннай вайны аперацыя савецкіх партызанаў пад кодавай назвай «Канцэрт» з мэтай масавага вываду са строю вялікіх участкаў чыгункі і ўскладнення аператыўных перавозак праціўніка. Гэтая аперацыя стала працягам «рэйкавай вайны». У ёй бралі ўдзел 193 партызанскія фарміраванні Беларусі, Прыбалтыкі, Карэліі, Крыма, Ленінградскай і Калінінградскай абласцей. У ходзе аперацыі было падарвана каля 150 тысяч рэек. Толькі беларускія партызаны падарвалі каля 90 тысяч рэек, 1041 эшалон, узарвалі 72 чыгуначныя масты, разграмілі 58 эшалонаў.



**1948** год — нарадзіўся Джэрэмі Айранс, англійскі акцёр. Лаўрэат прэміі «Оскар», прэміі «Залаты глобус».

**2003** год — у Ялце прэзідэнты Беларусі, Расіі, Украіны і Казахстана падпісалі Пагадненне аб фарміраванні Адзінай эканамічнай прасторы (АЭП).

Так гаварыў...

**ПУБЛІЙ СІР:**

*«Гледзячы на чужыя заганы, разумны пазбаўляецца ад сваіх».*

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.49 | 19.17 | 12.28 |
| Віцебск — | 6.38 | 19.09 | 12.31 |
| Магілёў — | 6.39 | 19.07 | 12.28 |
| Гомель — | 6.36 | 19.03 | 12.27 |
| Гродна — | 7.04 | 19.32 | 12.28 |
| Брэст — | 7.06 | 19.32 | 12.26 |

## Месяц

*Маладзік 15 верасня.*
*Месяц у сузор'і Скарпіёна.*

## Імяніны

***Пр.*** *Архіпа, Давыда, Дзмітрыя, Канстанціна, Кірыла, Міхаіла, Усевалада.*

***К.*** *Канстанцыі, Эмілі.*



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Двое дамаўляюцца аб першым спатканні.**
**Ён: «А як я вас пазнаю?»**
**Яна: «Вам насустрач будзе ісці жанчына, і вы падумаеце: «Божа! Толькі б не яна!» Дык вось гэта буду я!»**

Мой муж падтрымлівае мяне ў любых пачынаннях. Ён кажа: «Рабі што хочаш, толькі адчапіся!»

**На іспыце студэнт бярэ адзін білет — не ведае. Бярэ другі — таксама. Трэці — тая ж бяда... Далей чацвёрты, пяты... Прафесар бярэ залікоўку, ставіць яму «3». Іншыя студэнты абураюцца:**
**— За што?**
**— Як за што? — адказвае выкладчык. — Калі штосьці шукае, значыць, штосьці ведае.**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 10.387. Індэкс 63850. Зак. № 2238.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 18 верасня 2023 года.